**ДРА́МА** (ад грэч. drama, дзеянне), 1) адзін з трох родаў л-ры (разам з *эпасам* і *лірыкай*), у аснове якога — па-

Архив библиотеки МГУ имени

каз напружанага, скразнога дзеяння, вырашэнне канфліктнай сітуацыі. Генетычна ўзыходзіць да нар. абрадавага дзеяння. Радзіма Д. — стараж. Грэцыя (прыкладна 7 — 6 ст. да н.э.). Паводле «Паэтыкі» Арыстоцеля, Д. адлюстроўвае дзеянне праз само дзеянне, а не праз аповед. Пры гэтым для драм. дзеяння характэрны дынамізм, змястоўнасць, нарастанне напружанасці сюжэта ад завязкі да кульмінацыі. Роля аўтара ў Д. зведзена да мінімуму — праяўляецца ў рэмарках, спісах дзеючых асоб, апісаннях часу, месца дзеяння і г.д. Уласна тэкст Д. складаецца з выказванняў аднаго (маналог), двух (дыялог) ці некалькіх (палілог) персанажаў. Іх характары раскрываюцца ў непасрэдных сутыкненнях, канфліктах.

Д. як род л-ры падзяляецца на 3 асн. відавыя групы — камедыйная (сатыр., лірычная, сац.-быт. і інш. камедыі; камедыя становішчаў і характараў), трагедыйная і драм. (сац.-быт., псіхал., філас. і інш. Д.). На мяжы трагедыі і камедыі існуе трагікамедыя; разнавіднасцю Д. з'яўляецца меладрама. У сучасным літ.-знаўстве ўжываецца тэрмін «малая драма», які ўключае творы малой драм. формы (фарс, скетч і інш.).

2) Адзін з відаў драм. роду л-ры, у аснове якога ляжыць востры канфлікт, які не завяршаецца, аднак, трагічнай развязкай. Нараджэнне бел. Д. адбывался ў межах польскамоўнай драматургіі Рэчы Паспалітай 18 ст. («Чынш» Ф.Карпінскага, «Шлюб паводле календара» Ф.Багамольца, «Вяртанне дэпутата» Ю.Нямцэвіча). Аднымі з пачынальнікаў бел. Д. ў канцы 18 ст. былі настаўнікі Забельскага дамініканскага калегіума (Верхнядзвінскі р-н) К.Марашэўскі («Камедыя») і М.Цяцерскі («Доктар па прымусе»). У 19 ст. драм. творы пісаў В.Дунін-Марцінкевіч («Ідылія», «Залёты»). У пач. 20 ст. ў бел. Д. назіраюцца традыцыі нар. Д. («Цар Максімілян»), батлейкі — лялечнага тэатра («Цар Ірад»), інтэрмедый, характэр-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ных для пастановак школьных езуіцкіх тэатраў («Селянін і студэнт», «Іван і царкоўны вартаўнік»). Росквіту бел. Д. дасягнула ў творчасці Я.Купалы («Паўлінка», «Тутэйшыя»), К.Каганца («Модны шляхцюк»), Ф.Аляхновіча («На Антокалі»), К.Крапівы («Хто смяецца апошнім»). Традыцыю класікаў бел. л-ры працягнулі Р.Баравікова, К.Губарэвіч, А.Дудараў, А.Дзялендзік, Г.Каржанеўская, С.Кавалёў, А.Макаёнак, Г.Марчук, М.Матукоўскі, А.Маўзон, А.Махнач, І.Шамякін і інш. Для іх драм. твораў характэрна разнастайнасць тэматыкі, розныя кірункі творчасці. У сучаснай бел. драматургіі развіваецца таксама такая з'ява, як Д. рускамоўная (А.Курэйчык, П.Пражко, Д.Балыка, С.Гіргель, А.Папова і інш.).

*В.І.Еўмянькоў.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова